# ЭСТЭТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ ВУЧНЯЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ СРОДКАМІ НАРОДНАЙ ПЕСНІ

**А.М. Аляхновіч**
*кандыдат філалагічных навук, прафесар кафедры рэжысуры абрадаў і свят УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

Музычная спадчына народа – каштоўны выхаваўчы матэрыял для заняткаў з вучнямі пачатковых класаў як на ўроках музыкі, так і ў пазакласнай рабоце. Музычны фальклор заўсёды з’яўляўся школай зносін, працы, адзення, побыту, прыгажосці паводзін. У школе мала такіх прадметаў, якія фарміруюць не толькі веды, уменні і навыкі вучняў, але і здольнасць, жаданне адлюстраваць сябе непаўторна ў творчай дзейнасці. Народная песня, даступная ўсім без выключэння вучням, далучае кожнага да музычнага мастацтва, фарміруе яго светаадчуванне, разуменне прыгажосці і духу народнай культуры.

Здаецца, што далучыць вучняў да вывучэння фальклору магчыма пры ўмове засваення яго як самаго жыцця, у якім спалучаецца духоўны і матэрыяльны вопыт многіх пакаленняў, перададзены нам у спадчыну. Музычны фальклор адлюстроўвае вякамі сфарміраваныя ўяўленні чалавека аб прыродзе, светапабудове, прыгажосці і гармоніі, дабрабыце і шчасці чалавека, прадаўжэнні чалавечага роду. У той жа час мы не вельмі добра ведаем простыя рэчы пра сябе, пра акаляючы свет, не задумваемся аб сэнсе прадметаў, з’яў і інш.

Найбольш падыходзячы ўзрост для асваення фальклору – дашкольны і школьны, асабліва пачатковы, калі дзіця ўспрымае прыроду і свет сінкрэтычна, што адпавядае спецыфіцы фальклору як поліфанічнай з’явы, у якой зліты ў адзінае цэлае матэрыяльнае і духоўнае жыццё.

Музычны фальклор у мастацкай форме перадае дзецям вопыт мінулых пакаленняў, вучыць іх любіць сваю Радзіму, фарміруе пачуцці эстэтычных адносін да прыроды і людзей. Працягваючы традыцыі і ідэалы філосафаў мінулага Піфагора і Арыстоцеля, якія распрацавалі канцэпцыю музычнага выхавання як часткі эстэтычнага, Ф. Скарына ў сваёй асветніцкай дзейнасці надаваў значэнне музыцы як аднаму са сродкаў эстэтычнага выхавання: «Восхищем ли пак учитися музыки, то есть певсници, премножество стихов и песней светых по всей книзе сей знайдзеши».

Традыцыйная музычная спадчына як частка музычнай культуры народа ўздзейнічае на пачуцці, свядомасць, фарміраванне асобы вучня, яго этнічных рыс беларуса. У вучняў закладваецца падмурак маральна- этычных адносін да традыцыйнага мастацтва, выхоўваецца здольнасць успрымаць, эмацыянальна перажываць і ацэньваць народную песню, фальклорны інструментальны твор як з’яву мастацтва, узнаўляць іх у музычнай дзейнасці. Гэта дзейнасць уключае наступныя моманты: слуханне музыкі, выкананне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(народныя спевы і ігра на музычных інструментах, музычна-рытмічныя рухі, музычныя гульні). Нарэшце, вывучаючы музычную спадчыну, вучні далучаюцца да нацыянальнай культуры, гісторыі народа.

Прынцыпова важна, каб засваенне фальклору на ўроках адбывалася на добраахвотных пачатках, без прымусовага ўключэння ўсіх дзяцей незалежна ад іх схільнасцей і асаблівасцей характару ў фальклорнае дзеянне. Толькі ў гэтым выпадку фальклор можа быць метадам далучэння вучняў да здабыткаў народнай культуры. Для таго, каб стварыць на занятках сітуацыю «як у жыцці», настаўніку неабходна будаваць адносіны з вучнямі па прынцыпу старэйшага з малодшым, і ў гэтым яму дапаможа народная педагогіка. Так, настаўнік, валодаючы інфармацыйнай фальклорнай прасторай, стварае варыянты народнай гульні, песні, а вучні вусным шляхам перадаюць атмасферу фальклору па-свойму, індывідуальна. Для вывучэння фальклору не трэба механічна ўключаць у заняткі гульні, песні, элементы звычаяў і абрадаў.

Практыка паказвае, што асабліва карысна развучваць песню ў форме забавы, гульні. Вучні імкнуцца пераняць настаўніка, захаваць яго інтанацыю, эмацыянальны запал, а часам знаходзяць і ўласныя варыянты. Гуляючы, дзеці не думаюць аб вонкавым баку выканання. «Кола», у якім адбываецца дзеянне, стварае асаблівы мікраклімат, дзе дзейнічаюць свае законы, уласцівыя толькі фальклорнай традыцыі.

Вельмі цікавым і простым фальклорным матэрыялам для вучняў пачатковых класаў могуць быць лічылкі, загадкі, дражнілкі, калыханкі, а таксама абрадавыя песні. У калыханках заключана вялікая сіла любові маці да свайго дзіцяці, якая перадаецца ўсім, хто даглядае яго, а таксама элементы народнай педагогікі. Калыханкі складаліся вякамі, яны адлюстроўваюць суадносіны думак, рухаў, настрояў, мелодый, рытмаў, слоў, разлічаных на развіццё дзіцяці. Таму можна гаварыць аб тым, што калыханкі – вялікае дасягненне народнай педагогікі, непарыўна звязанае з практыкай выхавання дзяцей.

Працуючы над народнай песняй, трэба мець на ўвазе, што не ўсе творы можна разыгрываць, інсцэніраваць. Ёсць творы, якія па зместу не патрабуюць гэтага. З цягам часу вучні самі пачнуць знаходзіць абагульненыя жэсты, рухі, якія адлюстроўваюць вобраз песні. У наш час неабходна шукаць кампрамісныя шляхі выкарыстання фальклору ў школе, таму што натуральнае асяроддзе існавання традыцыі ў многім ужо страчана.

Вельмі пажадана, каб настаўнік, асабліва ў сельскай мясцовасці, займаўся збіральніцкай дзейнасцю, шукаў знаўцаў песеннай традыцыі, запрашаў іх на заняткі з вучнямі, таму што яны з'яўляюцца выразнікамі духу народнай культуры. Сустрэча з кожным цікавым, творчым чалавекам з народа – гэта далучэнне вучняў да вытокаў традыцыйнай культуры.

У адрозненні ад іншых прадметаў, якія вывучаюць дзеці ў пачатковых класах, народная песня мае спецыфічныя рысы, якія вылучаюць яе ў асобную катэгорыю – гэта творчасць і сатворчасць адразу, зараз, неадкладна, што не назіраецца пры вывучэнні іншых прадметаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, побач з навучальнымі мэтамі пры выкарыстанні народнай песні магчыма сфармуляваць і выхаваўчыя – спасціжэнне праз яе любові да сябе, да людзей, да свету.

Для таго, каб актывізаваць увагу вучняў, можна выкарыстоўваць вядомы метадычны прыём у педагогіцы – дыялог як шлях узаемадзеяння. У дадзеным выпадку многія народныя песні дазваляюць акцэнтаваць увагу вучня на ўсіх дэталях дыялогу, звярнуць увагу на дыкцыю, сілу гучання, міміку, пластыку, размову вачыма, жэстыкуляцыю. Менавіта яны ўтрымліваюць шмат магчымасці для імправізацый, дазваляюць вучню разнявольвацца, пазнаць самаго сябе, набыць пэўныя навыкі ў зносінах з гукам і выбудоўванні дыялогу з партнёрам. Пры гэтым вучні лёгка ўступаюць у кантакт паміж сабою і настаўнікам, вырашаюць канфліктныя сітуацыі. Пры гульнявой атмасферы заняткаў ствараюцца ўмовы для ўзаемаразумення пабудовы дыялогу.

Музычны фальклор уключае народную педагогіку, народную мудрасць, арганічна далучае вучняў да акаляючага жыцця, вучыць іх назіраць і разумець яго, існаваць у шчыльным кантакце з прыродай. Як гэтага не хапае нашым гарадскім вучням!

У пазакласнай рабоце з вучнямі можна выкарыстоўваць нескладаныя апрацоўкі спецыяльна падрыхтаваных народных песень, вучыць іх мастацтву інтанавання слова. Магчыма проста вымаўляць слова, а можна яго праінтанаваць так, што слухач адразу зразумее вобразны сэнс. Інтанаванне слова – гэта інтанаванне музычнае, падобнае самой музыцы. Усведамленне гэтай узаемасувязі дазваляе разумець музыку як «мастацтва інтанаванага сэнсу» (Б. Асаф’еў). Беражлівыя адносіны да паэтычнага слова вучаць адносінам да яго як да роднага слова. У той жа час, разумеючы глыбей паэтычны вобраз, вучні больш яскрава ствараюць вобраз музычны.

Неабходнай умовай паспяховага вывучэння народнай музыкі ў школе з’яўляецца выкарыстанне настаўнікам жывога, вобразнага слова, дыялектаў у спалучэнні яго з прыкладамі з літаратурных твораў, уражанняў вучняў ад зносін з прыродай, носьбітамі традыцый і інш.

Вядома, што вядучымі прынцыпамі фальклору з’яўляюцца вуснасць, калектыўнасць і імправізацыя выканання, пры гэтым кожны ўдзельнік выступае як творца і слухач. Адзначаныя прынцыпы існавання і перадачы фальклору адпавядаюць характару калектыўнага выхавання і навучання ў школе, прыродзе дзіцячага вобразнага ўспрыняцця рэчаіснасці.

Інсцэніруючы народную песню ў пазакласнай рабоце, вучні вучацца перадаваць характэрныя рысы розных персанажаў, рухацца адпаведна рытму, будуюць пэўныя мізансцэны, пластычныя дзеянні, выпрацоўваюць постаць і міміку, жэсты і інш. Заняткі музычным фальклорам садзейнічаюць пераадоленню ў вучняў такіх недахопаў, як сарамлівасць, нерашучасць, адсутнасць свабоды і інш.

Заняткі народнай музыкай ставараюць асаблівую атмасферу духоўнага жыцця вучняў, фарміруюць іх творчы патэнцыял, далучаюць да нацыянальных культурных вытокаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Песенны фальклор садзейнічае развіццю творчай дзейнасці школьнікаў, сацыяльнай накіраванасці асобы, абуджае творчую фантазію. Ён дазваляе ставіць перад дзецьмі пасільныя творчыя задачы і робіць іх сааўтарамі і аўтарамі ў творчасці, развівае музычна-творчыя здольнасці вучняў.

Музычнае выхаванне на аснове народнай музыкі стварае ў вучняў магчымасць лепш разумець і ацэньваць музыку іншых народаў, што з'яўляецца адным з важнейшых шляхоў інтэрнацыянальнага выхавання.

Важна, што ў музычным фальклоры выхаванне выступае не ў форме павучэнняў, натацый, а будуецца на прыкладзе ўзаемаадносін розных герояў, паводзін жывёл. У многіх народных песнях услаўляецца праца, справядлівасць, узаемадапамога і асуджаецца прагнасць, зайздрасць, непавага да бацькоў, пляткарства, ашуканства, няўдзячнасць, здрада. Фальклорныя творы развіваюць мысленне, кемлівасць, дапамагаюць пазнаць свет. Цікавыя ў пазнавальных адносінах і народныя песні-загадкі, а таксама музычныя гульні. Развіваючы музычныя здольнасці вучняў, музычны фальклор дапамагае пазбегнуць спажывецкіх адносін да культурных каштоўнасцей.

На працягу стагоддзяў у народзе ўсталявалася своеасаблівая сістэма эстэтычнага выхавання на аснове традыцыйнай культуры, у тым ліку музычнага фальклору. Як і ўяўленні аб прыгажосці, змест эстэтычнага выхавання быў складаным і шырокім. Сучаснае эстэтычнае выхаванне вучняў пачатковых класаў уключае наступныя аспекты:

– развіццё здольнасці разумець прыгажосць у акаляючай рэчаіснасці;

– выпрацоўка эстэтычнага густу;

– выхаванне ў вучняў творчых уменняў і навыкаў;

– выпрацоўка гармоніі паміж эстэтычным развіццём вучняў і іх маральным станаўленнем, разумовым выхаваннем і працоўнай падрыхтоўкай.

Гэтыя элементы ў працэсе эстэтычнага выхавання знаходзяцца ў розных суадносінах паміж сабой у залежнасці ад умоў жыцця, узроставых асаблівасцей вучняў, нарэшце, падрыхтоўкі настаўніка. Зразумела, што ў пачатковых класах у эстэтычным выхаванні большае месца займае развіццё і фарміраванне эстэтычнага густу. На аснове гэтых двух элементаў эстэтычнага выхавання пазней у вучняў фарміруецца творчая ініцыятыва ў стварэнні прыгожага.

Здольнасць бачыць і разумець прыгожае залежыць як ад узроўню эстэтычнага выхавання, так і ад індывідуальных асаблівасцей дзяцей. Ажыццяўленне задачы, накіраванай на ўмацаванне адзінства эстэтычнага выхавання з іншымі элементамі фарміравання асобы, залежыць ад майстэрства выхавацеля-настаўніка. У пачатковых класах гэта задача свядома вырашаецца толькі настаўнікам. Такім чынам, калі першы і другі элементы эстэтычнага выхавання дасягаюцца асабістай цікавасцю вучня да прыгожага, а трэцці элемент – яго творчай ініцыятывы, то чацвёрты – свядомай і актыўнай дзейнасцю настаўніка, стварэннем ім стройнай сістэмы выхавання. Абавязковай умовай эфектыўнасці работы па фарміраванню

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

развітых эстэтычных густаў вучняў з’яўляецца адзінства выхавання і самавыхавання, інакш кажучы, эстэтычнае выхаванне абавязкова ажыццяўляецца працай настаўніка і самаго вучня.

Народныя песні здаўна былі самым дзейсным сродкам выхавання ў дзяцей пачуцця прыгажосці. Іх выхаваўчая роля вельмі вялікая. Дзякуючы паэтыцы і прыгожай мелодыі, яны аказваюць на пачуцці і свядомасць вучняў моцнае ўздзеянне і надоўга захоўваюцца ў памяці. У змесце песні, яе выкананні і вывучэнні закладзены пэўныя заканамернасці, мэтанакіраваны педагагічны пачатак, сістэма выхаваўчага ўздзеяння.

Вобразна-паэтычнае мысленне народа адпавядае ўяўленням вучняў аб прыродзе і чалавеку. Менавіта таму ім цікавыя і даступныя многія народныя песні, якія спецыяльна для іх ствараліся. Песні заахвочваюць сваім зместам, тым, што ў іх сцвярджаецца цудоўнае ў жыцці і ў чалавечых адносінах і не прымаецца брыдкае. Дзякуючы эмацыянальнай насычанасці, песеннай лексікі, мноству пяшчотных слоў, эпітэтаў, багатай, выразнай мелодыі ўздзеянне народных песень на вучняў у эстэтычным выхаванні цяжка пераацаніць. Яны імкнуцца размаўляць больш складана, прыгожа, песня развівае ў іх пачуццё рытму.

Вялікае значэнне для разумення вучнямі зместу народных песень мае праца настаўніка, накіраваная на эстэтычнае ўспрыманне тэксту. Тут вельмі важна, наколькі выразна ён прачытае тэкст. Улічваючы ўражлівасць і эмацыянальнасць вучняў, трэба ў кожным асобным выпадку ствараць умовы для праяўлення і раскрыцця іх пачуццяў і перажыванняў, выкліканых паэтычным тэкстам, дапамагаць ім уявіць сабе карціны і вобразы песні. Ужо з першага класа трэба знаёміць вучняў са сродкамі песні, з асаблівасцямі паэтычнай мовы, рытмікай верша. Падрыхтоўчая работа над словам пабуджае вучняў чытаць песню ўдумліва, выразна, каб адчуваліся адлюстраваныя ў ёй адносіны да прыроды з’яў, персанажаў і інш. Дзякуючы гэтаму многія вучні на занятках добра запамінаюць тэкст песні. Даступнай работай над словам настаўнік дапамагае вучням заўважыць асаблівасці стылю і рытмікі песні, адрозніць звычайную мову ад паэтычнай, песеннай. Можна заўважыць, што, чытаючы і дэкламуючы тэкст песні, яны не толькі разумеюць яе сэнс, але і адчуваюць паэтычны настрой.

Вялікі здабытак музычнага фальклору – абрадавыя песні, якія дапаўняюць абрадавыя дзеі, раскрываюць іх змест, утрымліваюць міфалагічны кантэкст народнай спадчыны. Яны нескладаныя для выканання, могуць выконвацца ў руху, разыгрывацца пры дапамозе ўвядзення персанажаў. У гэтым сэнсе для вучняў пачатковых класаў цяжка знайсці падобны раўназначны матэрыял, які адпавядае прыродзе дзіцячага светаўспрымання, іх жаданню быць іншымі, пераапрануцца ў пэўны вобраз, персанаж і г.д.

Заняткі фальклорам садзейнічаюць фарміраванню станоўчых эмоцый у вучняў. Відавочна, што ў гэтым узросце адбываецца станаўленне механізмаў псіхікі, асобы вучняў. Эмоцыі аказваюць істотнае ўздзеянне на пазнавальны працэс вучняў. Як паказваюць даследванні псіхолагаў, эмоцыі ўмеранай і высокай ступені інтэнсіўнасці выклікаюць у іх дакладныя змены. Звычайна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

становчыя эмоцыі садзейнічаюць павышэнню, а адмоўныя – зніжэнню ўзроўню вучобы.

Важнае месца ў выхаванні вучняў 1–4-х класаў павінна займаць народная педагогіка, якая дайшла да нас з сівой старажытнасці ў абрадах, музычным фальклоры, казках, загадках, прыказках, гульнях. Без выкарыстання назапашанага народна-педагагічнага вопыту ў вучэбнай і выхаваўчай рабоце з малодшымі школьнікамі нельга стварыць падмурак нацыянальнай сістэмы адукацыі. Як сведчыць сусветны вопыт выхавання, без зберажэння ўласнай народнай педагогікі не могуць быць вырашаны многія праблемы сённяшняга выхавання і станаўлення самастойнай нацыянальнай школы.

У музычным фальклоры знайшлі адлюстраванне разнастайныя этна-педагагічныя традыцыі беларусаў: працоўныя, эстэтычныя, патрыятычныя, фізічныя, гістарычныя і інш. Праз народныя святы і звязаныя з імі фальклорныя творы, у дзяцей і падлеткаў фарміравалі любоў да працы, выхоўвалі руплівасць, стараннасць, пачуццё задавальнення вынікамі працоўнай дзейнасці, эстэтычны густ, розум, патрыятызм, псіхічнае і фізічнае здароўе. Зразумела, што выхаванне чалавека працы – вядучая і вызначальная этнапедагагічная традыцыя беларускага народа. Без працы нельга забяспечыць дабрабыт і шчасце чалавека, пра пгго сведчаць многія народныя песні.

Аўтар разумее, што вывучэнне музычнага фальклору ў школе сутыкаецца з пэўнымі цяжкасцямі. Фальклор не ўсведамляецца ў поўнай меры, як спецыфічная з’ява культуры, неадэкватная ў многім сучаснай свядомасці. Не улічваюцца стадыі яго шматвяковага развіцця, сучасны стан бытавання і пераасэнсаванне.

Пры вывучэнні абрадавых песень настаўнік, па магчымасці, можа пазнаёміць вучняў з умовамі іх бытавання. Так, пры знаёмстве з веснавымі песнямі вучням трэба расказаць, якім вялікім святам быў для вясковых хлопчыкаў дзень прылёту жаваранкаў – вестуноў вясны. Дзеці збіраліся групамі, прывязвалі «жаваранкаў», выпечаных з цеста, да жэрдкі, падымалі высока ўверх ці бегалі па вуліцы, трымаючы «птушак» у руках, падкідвалі іх у паветра. Пры гэтым спявалі песенькі-вяснянкі, заклічкі. У іх яны заклікалі, гукалі вясну.

Пад Новы год дзеці вясёлым гуртом хадзілі ад хаты да хаты, спявалі пад вокнамі віншавальныя песні-калядкі, у якіх жадалі гаспадару і яго сям’і добрага ўраджаю ў новым годзе, дабрабыту і шчасця. Зараз дзе-нідзе існуе звычай «засеўкі», калі вясковыя хлопчыкі і дзяўчынкі ходзяць па хатах аднавяскоўцаў, спяваюць вясёлыя віншаванні і сыплюць зерне на падлогу, жадаючы добрага ўраджаю. У гэтых творах шмат гумару, гарэзлівасці. За шчодрыя пажаданні спевакоў (калядоўшчыкаў) частуюць.

У заключэнне вызначым асноўныя элементы методыкі засваення вучнямі народнай песні:

1) прастата і даступнасць матэрыялу; 2) паслядоўнасць і сістэмнасць пры яго падборы, вывучэнні; 3) адпаведнасць народных песень узроставым асаблівасцям вучняў; 4) паступовасць ва ўскладненні Фальклорных твораў; 5)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

развіццё ініцыятывы вучняў;выкарыстанне цацак або малюнкаў, што забяспечвае сувязь паміж словам і прадметам дзеяння; 6) правядзенне заняткаў у гульнявой форме; 7) узнаўленне фрагментаў абрадаў з выкарыстаннем фальклорных твораў; 8) выкарыстанне народных інструментаў і прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

---

1. *Аляхновіч, А. М.* Народная песня ў школе / А. М. Аляхновіч. – Мінск : Беларусь, 2004. – 171 с.
2. *Аляхновіч, А. М.* Фальклор у выхаванні школьнікаў / А. М. Аляхновіч. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2008. – 200 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ